**ВОДЗЫЎ**

афіцыйнага апанента на дысертацыю

**КАРП АЛЕНЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ**

"Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс",

пададзеную на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыі Карп Алены Аляксандраўны адпавядае заяўленай спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія па філалагічных навуках.

Дысертацыя выканана ў аддзеле тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры ў межах НДР «Гісторыя беларускага літаратуразнаўства (XI–XXI стст.)» (кіраўнік – д.ф.н. Кісліцына Г. М.) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства»; НДР «Сістэма родаў, відаў і жанраў беларускай літаратуры ў дынаміцы літаратурнага працэсу» (кіраўнік – д.ф.н. Кісліцына Г. М.) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы».

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Актуальнасць дысертацыі Карп Алены Аляксандраўны абумоўлена зваротам да асэнсавання пытанняў станаўлення і развіцця беларускай крытыкі, яе асноўных эстэтычных прынцыпаў і прыёмаў. Крытыка з'яўляецца арганічнай часткай літаратурнага працэсу, выступае формай самаўсведамлення літаратуры. Гэта своеасаблівы фарпост літаратурнага працэсу. Крытыка ўдзельнічае ў фарміраванні літаратурнага канону, станаўленні пісьменніцкіх рэпутацый. Акрамя таго, літаратурная крытыка з'яўляецца ўплывовым сацыяльна-культурным інстытутам.

У нашым літаратуразнаўстве існуе шмат даследаванняў, прысвечаных тэарэтычнаму асэнсаванню літаратурнага працэсу, яго розных аспектаў, вывучэнню творчасці асобных аўтараў, асноўных літаратурных напрамкаў. Але тэарэтычнае асвятленне пытанняў развіцця крытыкі першай трэці XX стагоддзя абмяжоўваецца работамі М. Мушынскага (1975 г.), У. Конана «Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.)» (1968 г.), «Адам Бабарэка», С. Карабана «Нарысы гісторыі беларускай савецкай крытыкі 20–30-х гадоў», Т. Вабішчэвіч «Станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі (1900–1910-я гг.): фактары, механізмы, этапы», К. Мароз «Літаратурная крытыка Заходняй Беларусі» (2001 г.). Гэта значыць, што цэласнае канцэптуальнае даследаванне аднаго з ключавых этапаў развіцця крытычнай

думкі, першай трэці XX стагоддзя, напісанае з улікам сучасных навуковых і метадалагічных патрабаванняў, адсутнічае. Гэты факт таксама падкрэслівае значнасць даследавання А.А. Карп.

Стварэнне навукова абгрунтаванай гісторыі і тэорыі літаратурнай крытыкі з'яўляецца адной з найбольш актуальных праблем сучаснай навукі.

Літаратурная крытыка асэнсоўваецца А.А. Карп у ракурсе новых метадалагічных стратэгій, вучоны адыходзіць ад пазітывісцкага падыходу, калі літаратура разглядаецца толькі як сацыяльная з'ява. Суіскальнік робіць акцэнт на эстэтычным дыскурсе і такім чынам скіроўвае даследчыцкую ўвагу на саму сутнасць літаратуры, паколькі мастацкі твор – феномен перш за ўсё эстэтычны. Эстэтычны дыскурс айчыннай крытыкі не выступаў прадметам навуковага асэнсавання. У цэнтры ўвагі дысертанта – тэарэтыка-метадалагічныя праблемы літаратурнай крытыкі як сацыяльнай і ўласна эстэтычнай дзейнасці.

Алена Аляксандраўна Карп звяртаецца да аднаго са знакавых перыядаў у гісторыі як беларускай літаратуры, так і крытыкі ў прыватнасці. Менавіта ў першай трэці XX стагоддзя былі сфарміраваны тэарэтычныя аспекты айчыннай крытыкі, яе асноўныя метады і прыёмы. Першая трэць XX стагоддзя – перыяд вострай палемікі адносна тэндэнцый, напрамкаў развіцця літаратуры і літаратурнай крытыкі. Прадстаўнікі розных літаратурна-крытычных груп актыўна дыскутавалі адносна прынцыпаў і падыходаў да літаратуры, метадалогіі. Гэтыя аспекты таксама сталі прадметам асэнсавання ў дысертацыі Алены Аляксандраўны Карп.

Суіскальнік скіроўвае ўвагу на аналіз змястоўных, праблемных гісторыка-культурных аспектаў крытыкі, яе метадаў, вядучых персанальных камунікатыўных і інтэрпрэтацыйных стратэгій, тыпалогіі дыскурсаў.

**3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Дысертацыя Карп Алены Аляксандраўны ў праблемна-тэматычным і метадалагічным планах з'яўляецца навацыйным даследаваннем у беларускім літаратуразнаўстве. Суіскальнікам сфармуляваны новыя тэарэтычныя палажэнні і высновы, якія належным чынам абгрунтаваны.

Навуковая навізна даследавання, навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону, заключаецца ў тым, што Карп Аленай Аляксандраўнай сістэмна, канцэптуальна разгледжаны эстэтычны вектар развіцця айчыннай крытыкі першай трэці XX стагоддзя, вызначана яго логіка і структура, прасочана эвалюцыя. Даследаванне Карп Алены Аляксандраўны напісана з вышыні сённяшніх метадалагічных падыходаў.

Суіскальнік разглядае крытыку як з'яву ўніверсальную, якая ўключае і гісторыю, і тэорыю літаратуры, і саму літаратуру.

Значнасць праблемы, абранай у якасці аб'екта вывучэння, выводзіць даследаванне Карп Алены Аляксандраўны на канцэптуальны ўзровень.

Дысертант асэнсоўвае эстэтычны дыскурс беларускай літаратурнай крытыкі першай трэці XX стагоддзя ў тэарэтычным аспекце, акрэслівае яго вызначальныя ідэі, прынцыпы, этапы і эвалюцыю станаўлення. Важным аспектам дысертацыі А.А. Карп выступае зварот да асэнсавання камунікатыўнай прыроды крытыкі, паколькі ўсведамленне крытыкамі свайго адрасанта істотным чынам ўплывала на іх практыку.

Аленай Аляксандраўнай Карп сістэмна разгледжана станаўленне і генезіс літаратурнай крытыкі газеты "Наша ніва", яе ідэйна-эстэтычныя прынцыпы. Абгрунтавана вызначальная роля пераарынтацыі "Нашай нівы" на мадэрнізацыю і ўніверсалізацыю, якая заключалася ў арганічным спалучэнні нацыянальнага і агульначалавечага, павышэнні культуры творчасці, імкненні да ўключэння беларускай літаратуры ў агульнаеўрапейскі кантэкст. Пад гэтым ракурсам асэнсаваны крытычныя работы В. Ластоўскага, С. Палуяна, М. Багдановіча, А. Луцкевіча.

Суіскальнікам прааналізаваны эстэтычны дыскурс крытыкі 1920-х гадоў: аксіялагічныя і метадалагічныя аспекты крытыкі часопіса "Полымя", паказана яе неаднароднасць паводле ўзроўню прафесіяналізму, метадалагічных стратэгій; прадэманстравана жанравая і метадалагічная разнастайнасць палымянскай крытыкі, асэнсавана супрацьстаянне класавага і эстэтычнага падыходаў.

Дысертантам сістэмна ахарактарызаваны прыярытэты маладнякоўскай крытыкі, эстэтычная праграма аб'яднання "Маладняк", крытычная практыка А. Бабарэкі, Ул. Дубоўкі, Зм. Бядулі, Я. Пушчы, У. Чаржынскага, М. Каспяровіча, паказаны канфлікт паміж крытычнымі стратэгіямі "Маладняка" і "Узвышша". Акрэслены недахопы маладнякоўскай крытыкі.

Суіскальнікам даследавана эстэтычная парадыгма літаратурнай крытыкі "Узвышша", яе метадалогія, каштоўнасныя арыенціры.

Дысертантам паказаны працэс маргіналізацыі эстэтычных катэгорый у крытыцы 1930-х гадоў, разгледжана супрацьстаянне эстэтычнага дыскурсу і вульгарна-сацыялагічнай крытыкі ў 1930-я гады; прадэманстравана значэнне літаратурнай крытыкі Я. Коласа 1930-х гадоў.

А. А. Карп прааналізаваны актуальныя мадуляцыі літаратурнага поля і тыя сацыякультурныя фактары, якія ўплывалі на фарміраванне і трансфармацыю якасных характарыстык літаратурна-крытычнага дыскурсу.

Важным аспектам даследавання Карп Алены Аляксандраўны з'яўляецца зварот да асэнсавання праблемы рэцыпіента літаратурнай прадукцыі, праблемы чытача, разгляд праз гэту прызму адпаведных пісьменніцкіх стратэгій.

Аленай Аляксандраўнай Карп канкрэтызавана гісторыка-культурная роля асобных крытыкаў у літаратурным працэсе першай трэці XX стагоддзя,

сутнасць іх тэарэтычнага ўкладу, прааналізаваны іх погляды адносна тэндэнцый і спецыфікі развіцця літаратуры, метадалогіі літаратуразнаўства і крытыкі, выяўлена перспектыўнасць іх тэарэтычных падыходаў.

Развіццё беларускай крытыкі разглядаецца Карп Аленай Аляксандраўнай у кантэксце тагачасных гістарычных, грамадска-сацыяльных і культурных працэсаў.

Асэнсоўваючы камунікатыўную прыроду крытыкі, дысертант прасочвае яе ўплыў на фарміраванне мастацкага густу, эстэтычных ідэалаў сучаснікаў, а гэта значыць, і іх сістэмы каштоўнасцей.

Важным лічым заўвагу дысертанта, што павышэнне эстэтычнага ўзроўню мастацкай літаратуры бачылася тагачаснымі крытыкамі як важкі аргумент на карысць сцвярджэння паўнавартаснасці і самастойнасці нацыянальнай літаратуры, спрыяла ўзмацненню яе статуса. А.А. Карп дэманструецца інстытуцыянальная прырода крытыкі.

Даследаванне Алены Аляксандраўны Карп спрыяе стварэнню больш цэласнай і поўнай карціны развіцця айчыннай крытыкі, літаратуразнаўства і літаратуры ў цэлым.

Суіскальнікам праведзены значны аб'ём даследчыцкай работы – сістэмна прааналізаваны асноўныя перыядычныя выданні першай трэці XX стагоддзя, матэрыялы літаратуразнаўчых і крытычных дыскусій.

Варта адзначыць і адэкватнасць метадалагічнага інструментарыя – структурны аналіз, дыскурс-аналіз, культурна-гістарычны метад, метад цэласнага інтэграцыйнага аналізу.

Дысертацыя Карп Алены Аляксандраўны сваім аб'ектам, прадметам, метадалогіяй, высновамі ўносіць важкі ўклад у беларускае літаратарузнаўства.

**4. Абгрунтаванасць і даставернасць вывадаў і рэкамендацый, якія сфармуляваны ў дысертацыі.**

Вынікі, атрыманыя ў дысертацыі, адпавядаюць навуковым палажэнням, якія выносяцца на абарону.

Ступень дакладнасці атрыманых вынікаў вызначаецца дастатковым аб'ёмам тэарэатычнага матэрыялу, вывучаным па праблеме даследавання (233 наймення ў спісе выкарыстаных крыніц) і адпаведным узроўню сучаснай навукі абгрунтаваннем зыходных тэарэтычных палажэнняў, а таксама доказнымі вынікамі, якія атрыманы ў працэсе аналізу.

Мэты і задачы, сфармуляваныя Карп Аленай Аляксандраўнай, дасягнуты. Прапанаваныя высновы аргументаваныя, сведчаць пра асабісты ўклад суіскальніка ў навуку і могуць быць выкарыстаны для вырашэння іншых навуковых або прыкладных задач.

Дысертацыя Карп Алены Аляксандраўны валодае ўнутраным адзінствам, мае навуковую і практычную значнасць, з'яўляецца самастойнай

навукова-кваліфікацыйнай працай, што пацвярджаецца наяўнасцю новых тэарэтычных палажэнняў у дачыненні да прадмета даследавання.

**5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Вынікі дысертацыі можна характарызаваць як дастатковыя ў адносінах да прадмета даследавання.

Матэрыялы і вывады даследавання могуць быць выкарыстаны ў навуковай сферы – вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры, крытыкі, літаратуразнаўства.

Тэарэтычная значнасць даследавання А. А. Карп заключаецца ў тым, што яго вынікі ўносяць істотны ўклад у развіццё тэорыі і гісторыі развіцця айчыннай крытыкі. Распрацаваныя суіскальнікам падыходы плённыя для далейшага асэнсавання гісторыі развіцця беларускай літаратуры.

Практычная значнасць дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што яго вынікі могуць быць выкарыстаны ў працэсе выкладання ў ВНУ курсаў па гісторыі крытыкі, літаратуразнаўстве і гісторыі літаратуры, дысцыплін кампанента ўстаноў вышэйшай адукацыі, тэматычна звязаных з вывучэннем літаратурнай крытыкі; пры стварэнні новага пакалення падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, пры складанні праграм па гісторыі беларускай літаратуры і культуры.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў друку.**

14 публікацыях: 4 артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (1,96 аўт. арк.), 7 публікацый матэрыялаў выступленняў на навуковых канферэнцыях (2,17 аўт. арк.), 1 тэзісы дакладаў (0,17 аўт. арк.), 2 публікацыі ў перыядычным друку (0,7 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 5 аўтарскіх аркушаў.

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі Карп Алены Аляксандраўны ў цэлым, асобных яе частак і аўтарэферата адпавядае патрабаванням Інструкцыі па афармленню дысертацыі і аўтарэферата.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Навуковая кваліфікацыя суіскальніка адпавядае ступені кандыдата філалагічных навук.

**9. Заўвагі па дысертацыі.**

Станоўча ацэньваючы дысертацыйнае даследаванне Карп Алены Аляксандраўны, лічым неабходным указаць на асобныя спрэчныя моманты.

1. У некаторых выпадках хацелася б бачыць больш высокую ступень карэляцыі паміж пастаўленымі задачамі даследавання, атрыманымі вынікамі і палажэннямі, якія выносяцца на абарону. Дысертантам вызначана чатыры задачы, палажэнняў жа і высноў прадстаўлена пяць. Палажэнні і высновы 1 і 2 раскрываюць змест задачы № 1.

2. Варта было пашырыць геаграфію публікацый артыкулаў са спісу, рэкамендаваных ВАК (3 з 4 апублікаваны суіскальнікам ў часопісе "Полымя").

3. У рабоце сустракаюцца стылістычныя недакладнасці: "Крытык выбіраў сімпатычных сабе аўтараў" (с. 41), "рэгламентаваўся літаратурны герой" (с. 48), "крытыка ўказвала таксама супрацьлеглы бок" (с. 59), "Адраджэнская літаратура ўспрымалася з належнай удзячнасцю" (с.86).

Выказаныя заўвагі не ставяць пад сумненне добры навуковы ўзровень дысертацыі, не ўплываюць на агульную высокую ацэнку работы, не датычацца яе навізны, навуковай значнасці, палажэнняў, вынесеных на абарону, і заключных вынікаў.

**Заключэнне**

Дысертацыя Карп Алены Аляксандраўны з'яўляецца самастойна выкананай навукова-кваліфікацыйнай работай. Работа адпавядае патрабаванням пунктаў 19, 20 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь".

Вучоная ступень кандыдата філалагічных навук за дысертацыю "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс" (спецыяльнасць 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія) можа быць прысуджана Карп Алене Аляксандраўне за:

– сістэматызацыю значнага эмпірычнага матэрыялу – крытычных работ першай трэці XX стагоддзя, матэрыялаў літаратуразнаўчых і крытычных дыскусій; вызначэнне ўмоў і фактараў станаўлення эстэтычнага дыскурсу айчыннай крытыкі першай трэці XX стагоддзя;

– стварэнне навукова абгрунтаванай мадэлі эвалюцыі эстэтычнага вектара развіцця айчыннай крытыкі першай трэці XX стагоддзя, вызначэнне яго логікі, асноўных прынцыпаў, метадаў і стратэгій;

– абгрунтаванне камунікатыўнай і інстытуцыянальнай прыроды беларускай крытыкі першай трэці XX стагоддзя; асвятленне спецыфікі функцыянавання крытыкі першай трэці XX ст. як камунікатыўнага акта, вызначэнне яе адрасата;

– характарыстыку значэння нашаніўскай крытыкі для далейшага развіцця крытычнай думкі Беларусі, станаўлення нацыянальнага канона, выпрацоўкі літаратурных рэпутацый;

– абгрунтаванне ролі эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1920-х гг., характарыстыку яе ідэй, метадаў, прынцыпаў, крытычнай практыкі яе знакавых прадстаўнікоў; раскрыццё перамнасці з нашаніўскай традыцыяй;

– апісанне спецыфікі функцыянавання эстэтычнага дыскурсу ў літаратурнай крытыцы 1930-х гг.; асвятленне працэсу трансфармацыі крытычных ідэй і прынцыпаў, абумоўленых грамадска-сацыяльнымі абставінамі першай трэці ХХ стагоддзя;

– характарыстыку дзейнасці, крытычных стратэгій як найбольш прадстаўнічых і знакавых крытыкаў першай трэці ХХ стагоддзя, так і пісьменнікаў, якія выступалі з крытычнымі работамі.

Афіцыйны апанент:
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры беларускай літаратуры
ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” А. М. Мельнікава

Подпіс А.Н. Мельниковой
ЗАВЯРАЮ
Начальнік аддзела кадраў
17.03.2023 О.Т. Зайцева
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

З водзывам азнаёмлена
А. Карп (Карп А. А.)
17.03.2023 г.

Водгук паступіў у савет па абароне дысертацый
Д 01.42.04 17.03.2023 г. Вучоны сакратар
савета (Богдан А. І.)